**Якаўлева, С.** На стваральнай перадавой / С. Якаўлева // Герой працы (Шуміліна). — 2003. — 14 лют. — С. 1.

## НА СТВАРАЛЬНАЙ ПЕРАДАВОЙ



Беларуская прымаўка «Дзе нарадзіўся – там і прыгадзіўся» вельмі падыходзіць жыхару вёскі Мікіціха, саўгаснаму перадавіку Валерыю Лісаву.

За 36 год свайго жыцця ён практычна не выязджаў з гэтай мясцовасці, хіба што на службу ва Узброеныя Сілы. А служыць яму давялося ў 1985–87 гадах у самай на той час «гарачай кропцы», у Афганістане.

Выпрабаванне агнём ён вытрамаў годна, мае медаль «За баявыя заслугі», але галоўнае, што не згубіў сябе. 15 лютага для беларускіх афганцаў, што жывуць на тэрыторыі адной гаспадаркі (а гэта – Міхаіл Шуміла, Павел Аўсянкін, Пётр Бараноўскі), – падстава для таго, каб сабрацца разам, успомніць баявыя шляхі, якімі кожнаму з іх давялося прайсці, хто не вярнуўся ў бацькоўскія хаты. За будзённымі клопатамі мірнага жыцця час лятіць неўпрыкмет, асабліва з вясны да восені, калі ў саўгасе шмат работы. Але працаваць да мазалёў Валерыю нават падабаецца, абы мець годную аплату за сваю працу.

Сіл жа і жадання быць у ліку правафланговых яму не займаць. Тры гады запар Валерый выходзіў пераможцам раённага спаборніцтва сярод механізатараў, занятых на касьбе траў. Нездарма яго партрэт упрыгожвае раённую Дошку гонару.

А калі па шчырасці, то больш, чым прыхільнасцю начальства ці павагай таварышаў па рабоце Валерый Лісаў даражыць дабрабытам і спакоем сваёй сям'і. Надзейна ахоўвае дамашні ачаг жонка Валянціна, падрастаюць дзеці, бацькоўская пацеха і надзея, – Аляксей і Даша. І калі менавіта ў сямейным тыле шчасце Валерыя – няхай гэты тыл мацнее, а на працоўнай перадавой ён, безумоўна, не падвядзе.

**С. Якаўлева**